## Жылле для “чарнобыльцаў”.

Ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС пацярпелі 153 населеныя пункты ў 10 раёнах Мінскай вобласці. У цэнтральным рэгіёне было пераселена 8,5 тысячы сем’яў — больш чым 25 тыс. чалавек.

Як паведаміў начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінскага аблвыканкама Аляксандр Шылак, сёлета на пераадоленне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на Міншчыне будзе выдаткавана больш чым 27 мільярдаў рублёў. Гэта практычна на трэць перавышае аб’ём адпаведнага фінансавання ў мінулым годзе. Значная частка сродкаў (амаль 12 млрд руб.) пойдзе на выплаты льгот і кампенсацый пацярпелым катэгорыям. Каля 10 млрд рублёў плануецца выдаткаваць на правядзенне ахоўных мераў у сельскай гаспадарцы. Праводзіцца будаўніцтва акушэрска-гінекалагічнага корпусу ў Валожыне. Агульны аб’ём фінансавання гэтага аб’екта — 4 мільярды рублёў, з якіх ужо асвоена 1,5 млрд. Сёлета будзе здадзена ў эксплуатацыю 15 кватэр для "чарнобыльцаў". На працягу найбліжэйшых двух гадоў плануецца поўнасцю вырашыць "кватэрнае пытанне" для гэтай катэгорыі. Паводле апошніх звестак, усяго ў чарзе на атрыманне сацыяльнага жылля стаяць 70 "чарнобыльцаў".

***Мікалай ЛІТВІНАЎ.***

**Источник:** Звязда.-2009.-25 крас.-С.3.